Падтрымай "Вясну" на PATREON

На маёмасць пінскіх палітвязняў накладваюць арышт. Толькі блытаюць паміж сабой абвінавачаных

21.10.2020 **Тэгі**: палітвязні, следчы камітэт

У пінскіх палітвязняў праходзяць дома ператрусы. Следчыя апісваюць іх маёмасць і накладаюць на яе арышт. Аднак пры ўручэнні адпаведных дакументаў блытаюць фігурантаў "пінскай справы": праводзяць ператрус у доме аднаго чалавека, а пастанову ўручаюць іншага.



Сваякі палітычных зняволеных пінчукоў. Фота: spring96.org

Сваякі пінскіх палітвязняў паведамляюць, што ператрус быў праведзены ў доме 19-гадовага **Данііла Богната**. Аднак яго сваякам уручылі пастанову аб накладанні арышту на маёмасць іншага палітвязня — **Вячаслава Рагашчука**.

Праваабаронца "Вясны" **Аляксандр Вайцешык** мяркуе, што ператрусы ў хуткім часе будуць праведзеныя ў дамах іншых фігурантаў "пінскай справы".

Як адзначае следчы Пінскага міжраённага аддзела Следчага камітэта **А. Барчук**, арышт на маёмасці абвінавачаных па ч. 2 арт. 293 Крымінальнага кодэкса (удзел у масавых беспарадках) ажыццяўляецца *"ў мэтах забеспячэння пакрыцця нанесенай шкоды (шкоды), грамадзянскага пазову і іншых маёмасных спагнанняў"*.

Арышты маёмасці санкцыянуе намеснік Пінскага межараённага пракурора **Аляксандр Плескацэвіч**. Як распавядалі родныя Вячаслава Рагашчука, 12 жніўня на прыёме ў яго з нагоды збіцця ў РАУС Вячаслава і іншых пінчукоў, ён пераконваў, што фізічнай сілы там у дачыненні да затрыманых не ўжывалася.

> *"Мы кажам, што ён збіты, а ён нам: "Вы што, я вас запэўніваю, я вам слова даю, я там усю ноч быў: ніхто нікога не біў. Вы разумееце, у міліцыі ёсць такая структура, іх кайданкамі прыкоўваюць і на падлогу кладуць. Вось ён, напэўна, калі клаўся — упаў. Ён жа галаву сабе не зберажэ". Я кажу: "У яго гематома за вухам! Тут ён упаў, а потым перавярнуўся і пачаў біць сябе ў іншым месцы?"* — распавядала сястра Вячаслава Кацярына.



Стан палітвязня Вячаслава Рагашчука ў СІЗА пагаршаецца. Родныя настойваюць на яго шпіталізацыі

Сястра палітвязня Вячаслава Рагашчука паведаміла "Вясне", што 13 кастрычніка атрымала ліст ад брата, дзе ён працягвае скардзіцца на сваё здароўе. Лекар у СІЗА сказала яму, што гэта можа быць "кровазліццё, страсенне мозгу або траўма галавы". Родныя Вячаслава настойваюць, што яму неабходна паўнавартаснае абследаванне галавы для належнага лячэння ў адпаведнасці з дыягназам. Яны асцерагаюцца пагаршэння стану яго здароўя.

Праваабаронцам "Вясны" вядома, што пасля акцый пратэсту 9-10 жніўня ў Пінску былі распачатыя крымінальныя справы аб масавых беспарадках мінімум на 13 чалавек, дзесяць з іх прызнаныя палітычнымі зняволенымі.





«Гэта было ўжо не збіццё, гэта былі катаванні». Пяць гісторый палітвязняў «Пінскай справы»


"Вясна" сустрэлася са сваякамі пінскіх палітвязняў у Баранавічах каля СІЗА, куды яны прыехалі ўсе разам, каб перадаць сваім блізкім перадачы. Мы пагутарылі з імі і нам удалося даведацца гісторыі пяці палітычных зняволеных пінчукоў. З чаго пачалася "Пінская справа", як яе фігурантамі сталі Вячаслаў Рагашчук, Алена Маўшук, Станіслаў Міхайлаў, Алег Рубец і Данііл Богнат, што яны пішуць у сваіх лістах — чытайце ў нашым матэрыяле.

Твитнуть




Вясна. Правы чалавека ў …
9 921 "Нравится"
ВЯСНА
Нравится
Свяжитесь с нами



СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ
Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску
"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ
Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы
Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных
WWW.GAZETABY.CO


ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА
"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі" – акцыя вясноўцаў у Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

"Суды згубілі сваю функцыю, а грамадзянская супольнасць перанесла знішчальную атаку". Павел Сапелка — на канферэнцыі АБСЕ

Праваабарончая праграма "Вясна" на Беларускім Радыё Рацыя

Грамадзяніна Польшчы асудзілі ў Беларусі за "агентурную дзейнасць"

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць







ПАРТНЁРСТВА

РАДЫЯ

kamunikat
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

ВЫТОКІ

ADC memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

МІЖНАРОДНЫ КАМІТЭТ ПА РАССЛЕДАВАННІ КАТАВАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

СЯБРОЎСТВА

EENEMO

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

VOICE OF BELARUS

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

